УДК 946.7

***В.П. ГАРМАТНЫ***

# АГРАРНАЯ ПАЛІТЫКА ПОЛЬСКІХ УЛАД НА ЗЕМЛЯХ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921 – 1939 гг.)

*У артыкуле разглядаецца аграрная палітыка польскага ўраду на землях Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг., яе мэты, рэалізацыя і вынікі. Пасля атрымання Польшчай незалежнасці ў яе складзе аказаліся тэрыторыі, якія да гэтага ўваходзілі ў склад трох розных дзяржаў: Расійскай Імперыі, Прусіі і Аўстра-Венгрыі. Перад польскімі ўладамі паўстала першачарговая задача – уніфікаваць сацыяльна-эканамічнае развіццё новадалучаных тэрыторый, вырашыць аграрнае пытанне, якое паўстала з асаблівай вастрынёю, а таксама стварыць і ўмацаваць агульны ўнутраны рынак. З гэтай мэтаю польскі ўрад правёў шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку зямельную рэформу: дзеля таго каб узнавіць разбураную пасля першай сусветнай і савецка-польскай 1919 – 1920 гг. войн сельскую гаспадарку краю, а таксама паспяхова каланізаваць усходнія ваяводствы.*

У выніку заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага мірнага дагавора да Польшчы (Другой Рэчы Паспалітай) адышлі былая Гродзенская губерня, На-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

вагрудскі, Пінскі, частка Мінскага, Слуцкага і Мазырскага паветаў Мінскай губерні, Вілейскі, Дзісненскі і Лідскі паветы Віленскай губерні. Такім чынам, пасля савецка-польскай вайны 1919 – 1920 гг. амаль палова беларускіх зямель апынулася ў складзе Польскай дзяржавы. На гэтых землях уводзіўся прыняты ў Польшчы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел – ваяводствы, паветы, гміны. За тэрыторыяй Палескага, Навагрудскага, часткай Віленскага і Беластоцкага ваяводств замацавалася неафіцыйная назва "Заходняя Беларусь" (у афіцыйных польскіх дакументах для вызначэння гэтых зямель выкарыстоўваўся іншы тэрмін – "Крэсы Усходнія", што значыць "усходнія ўскраіны").

У 1931 г. 85% насельніцтва краю жыло ў вёсцы, 79% працавала ў сферы сельскай гаспадаркі – такія суадносіны захоўваліся на працягу ўсяго перыяду знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. Такім чынам, у 1921 – 1939 гг. Заходняя Беларусь была адносна адсталай ускраінай Польскай дзяржавы, але такая сітуацыя ўзнікла не па віне польскіх улад, а ў выніку асаблівасцей папярэдняга гістарычнага развіцця рэгіёна.

Сяляне Заходняй Беларусі пакутавалі ад малазямелля і беззямелля, у сельскай гаспадарцы захоўваліся перажыткі прыгонніцтва (буйное памешчыцкае землеўладанне, сервітуты, шарваркі, цераспалосіца). Дзяржава аказвала фінансавую і іншую дапамогу найбольш бедным сялянскім гаспадаркам. Так, у 1921 г. сялянам Жабінкаўскай гміны Кобрынскага павета Палескага ваяводства было выдзелена 3436 пудоў бульбы і аказана фінансавая дапамога ў 564 009 марак, Сяхновіцкай на асенні сеў – 4324 пуды жыта. Праводзіўся збор ахвяраванняў на карысць афіцэраў, салдат, сірот і г.д.

У сярэдзіне 1930-х гг. у руках трох тысяч памешчыкаў і двух тысяч найбольш заможных сялян знаходзілася 3,2 мільёны га зямлі, а разам з дзяржаўнымі ўладаннямі і ўладаннямі касцёла – 4,1 мільёны га зямлі. Вядучае месца ў памешчыцкай гаспадарцы займалі латыфундыі плошчай ад 2000 да 10 000 га. На адзін маёнтак у сярэднім прыходзілася каля 500 га зямлі, а на сялянскі двор – каля 7 га, прычым амаль 55 тысяч гаспадарак мелі надзел менш 1 га, а многія сяляне былі наогул беззямельнымі. Каля 500 магнатаў валодалі больш 1000 га – такой канцэнтрацыі зямлі не назіралася ні ў адной іншай тагачаснай краіне Еўропы [1, с. 16; 2, s. 67]. У той жа час каля 610 тысяч сялянскіх гаспадарак валодалі 4,32 мільёны га зямлі (51,4% усёй ворнай зямлі), а з іх 56% мелі зямлі менш 5 га.

Трэба адзначыць, што значная частка сялянства ў часы войн і рэвалюцый спрабавала сілай забраць зямлю ў памешчыкаў. Пасля ўсталявання польскай дзяржавы сялянства не толькі Заходняй Беларусі, але і ўсёй Польшчы патрабавала надзялення яго зямлёю без выкупу. Правячыя колы разумелі, што калі не вырашыць гэтую праблему "зверху", то вырашэнне сялянскага пытання можа адбыцца "знізу". Само жыццё паставіла перад польскімі ўладамі пытанне карэннага змянення аграрнай палітыкі – правядзення зямельнай рэформы.

10 ліпеня 1919 г., у час польска-савецкай вайны, Сейм прыняў так званыя "Асновы зямельнай рэформы і адзяржаўлення лясоў" – першы закон аб аграрнай рэформе, згодна якому ствараўся дзяржаўны зямельны фонд са свабодных зямель, а таксама праводзіўся выкуп і парцэляцыя часткі памешчыцкіх зямель звыш устаноўленага максімальнага памеру зямлі: для Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны гэты максімум вызначаўся ў 400 га, у той час як для этнічнай Польшчы – 180 га. Гэты закон не быў апублікаваны ў дзяржаўным друкаваным органе "Dziennik ustaw Rzeczy Pospolitej Polskiej", таму не прыняў характар закона і не меў абавязковай сілы [3, с. 25]. Калі Чырвоная Армія стаяла ў варот Варшавы, Сейм, каб прыцягнуць сялянства на свой бок, у хуткім парадку 15 ліпеня 1920 г. прыняў новы закон аб аграрнай рэформе: "Выканаўчыя правілы да закону

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

аб зямельнай рэформе ад 10 ліпеня 1919 г." У першую чаргу зямлёю павінны надзяляцца парабкі, якія трацілі работу ў выніку рэформы, салдаты польскай арміі пасля вяртання іх з вайны, а таксама беззямельныя сяляне, якія нічым іншым не займаліся.

Для правядзення рэформы ствараліся ваяводскія акруговыя дэлегатуры (прадстаўніцтвы), якіх потым перайменавалі ў акруговыя ўправы Галоўнай зямельнай управы з наступнымі аддзеламі: адміністрацыйны, які кіраваў работай управы; сельскагаспадарчы – ведаў правядзеннем парцэляцыі; тэхнічны – зямельнымі тэхнічнымі работамі; меліяратыўны. Пры ўправе працавала акруговая зямельная камісія, якая разглядала спрэчныя пытанні, давала ацэнку якасці зямлі, вылічвала плошчу зямлі ў памешчыцкіх маёнтках, што падлягалі правядзенню парцэляцыі.

Рэформа мела наступныя складаючыя часткі: насаджэнне асадніцтва (асаднікі – былыя ўдзельнікі савецка-польскай вайны 1919 – 1920 гг., якія за службу ў польскай арміі атрымоўвалі свабодныя сельскагаспадарчыя землі на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны), правядзенне камасацыі (хутарызацыі), парцэляцыі (продаж зямлі малымі надзеламі) і ліквідацыі сервітутаў (сумеснага зямельнага карыстання). Самай галоўнай і важнай з іх стала палітыка насаджэння польскімі ўладамі на землях Заходняй Беларусі вайсковага асадніцтва з мэтай паспяховай каланізацыі гэтай тэрыторыі.

17 снежня 1920 г. польскі Сейм па прапанове ўрада Вінцэнта Вітаса прыняў закон аб вайсковым асадніцтве. Гэты закон падзяляўся на дзве часткі, якія дапаўнялі адна другую і складалі непарыўнае адзінства. Першая ўстанаўлівала парадак надзялення зямлёю добраахвотнікаў, інвалідаў і заслужаных салдат польскай арміі; па другой, для надзялення іх зямлёю пачынаў існаваць асобны зямельны фонд з плошчаў на ўсходніх землях Рэчы Паспалітай [4, s. 215; 5, s. 4-5]. Закон ад 17 снежня 1920 г. аб надзяленні зямлёю ветэранаў савецка-польскай вайны быў прыняты пасламі Сейма аднагалосна і ўзнагароджаны апладысментамі [6, s. 27].

У распараджэнні старшыні Галоўнай зямельнай управы, выдадзеным 23 красавіка 1921 г., тлумачыцца, каго закон разумеў пад салдатамі польскай арміі, якія маглі атрымаць асады (зямельныя надзелы) бясплатна. Гэта радавыя і сяржанты, афіцэры і генералы, а таксама прыроўненыя да іх служачыя польскай арміі і падраздзяленняў добраахвотнікаў, якія неслі вайсковую службу не менш чатырох месяцаў. Згодна з законам не маглі атрымаць зямлі салдаты, якія пакараны за злачынствы супраць узброеных сіл польскай дзяржавы, а таксама тыя, што самавольна бралі ў карыстанне чужыя землі.

Урад меркаваў з дапамогай асаднікаў дасягнуць некалькіх мэт:

1. Аблегчыць мабілізацыю ў польскую армію (вайскоўцы мелі магчымасць атрымаць надзел зямлі).
2. З дапамогай перасялення на ўсход жыхароў карэннай Польшчы урад спрабаваў зменшыць зямельны голад у цэнтральных ваяводствах Другой Рэчы Паспалітай.
3. Стварыць надзейную прадуктовую базу на выпадак магчымай вайны з Савецкім Саюзам.
4. Выкарыстаць асаднікаў супраць савецкай улады у выпадку вайсковай неабходнасці дзякуючы іх канцэнтраванню ўздоўж мяжы з Савецкім Саюзам.
5. Падтрымаць мясцовыя антысавецкія элементы, якія ў будучым можна было таксама выкарыстаць у выпадку вайны з Савецкім Саюзам.

У абавязак асаднікаў уваходзілі таксама збор звестак агентурнага характару, дапамога ў барацьбе з партызанамі і садзейнічанне пры аб'яўленні прызыву ва ўзброеныя сілы, арганізацыя варты мастоў і чыгунак [7, с. 72-73].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Падбор асаднікаў і размеркаванне іх фактычна ажыццяўляў Генштаб. Падбіралі і размяркоўвалі асаднікаў сістэмна. Уся займаемая пад асады зямля, а таксама бліжэйшыя тэрыторыі разбіваюцца на сектары, прычым "улічваецца вайсковы профіль". Ніжэйшае звяно кіруецца афіцэрам, які таксама жыве тут жа ў асадзе, далей ідуць гмінныя, павятовыя і акружныя арганізацыі. Паміж гэтымі арганізацыямі існуе пастаянная сувязь і дысцыпліна, як у войску, рэгулярна праводзяцца вайсковыя заняткі. Асаднікі падпарадкаваны вышэйшаму вайсковаму камандаванню і трымаюць непасрэдную сувязь з войскамі, якія раскватараваны паблізу.

Большасць асаднікаў атрымлівала на тэрыторыі Заходняй Беларусі па нізкім кошце ці наогул бясплатна па 15-45 га зямлі ў залежнасці ад вайсковых заслуг і звання: па агульнапрынятым правіле палкоўнік атрымоўваў 30 га зямлі, капітан – 20, паручнік – 15, радавы – каля 9-10 га, але былі і такія асаднікі, якія атрымалі толькі па 3-5 га зямлі. Асаднікамі станавіліся таксама і генералы. Кожнаму асадніку выпісвалася пасведчанне і выдаваўся асаблівы знак, усе яны аб'ядноўваліся ў саюз, які атрымаў назву "Саюз былых абаронцаў усходніх ускраін". На месцах ствараліся розныя гурткі і арганізацыі – "Кулкі Рольнічэ", "Каса Стэфчыка", "Стшэлец" і інш., дзе галоўная роля належала асаднікам. Яны вучылі сялян новым – капіталістычным – метадам вядзення сельскай гаспадаркі, арганізоўвалі спартыўныя спаборніцтвы, тэатральныя і музычныя прадстаўленні, школы і бібліятэкі, народныя дамы.

Вайсковым каланістам для арганізацыі гаспадарак дзяржава выдзяляла коней, буйную рагатую жывёлу, свіней і іншую маёмасць. Толькі за 1922 г. вайсковыя асаднікі Брэст-Бужскага (Брэсцкага) павета Палескага ваяводства атрымалі ад польскіх улад 180 коней, 200 кароў, 90 авечак, 140 свіней, 4000 пудоў збожжа для севу, 5000 пудоў бульбы бясплатна [8, с. 31]. Памер аплаты за зямлю быў прыраўнаваны да 30-100 кг збожжа з 1 га штогод з выплатай дзяржаве на працягу 30 гадоў, пачынаючы з пятага года пасля атрымання зямлі. Дзяржава аказвала дапамогу перасяленцам натурай або грашыма для абзавядзення гаспадаркай. На гаспадарку выдзялялася 80 м$^3$ будматэрыялаў і 2 млн марак грашыма, інвентаром або збожжам. Асадніка абавязвалі пасяліцца на сваім водрубе на працягу аднаго года і ў трохгадовы перыяд асвоіць яго [3, с. 27].

На пачатак 1930-х гг. з 7917 членаў "Саюза асаднікаў", якія валодалі землямі ў Заходняй Беларусі, па роду заняткаў да прызыву на вайсковую службу 5576 (70,3%) складалі сяляне, 566 (7,1%) – службоўцы, 525 (6,6%) – навучэнцы, 544 (6,9%) – рамеснікі, 409 (5,2%) – кадравыя вайскоўцы, 89 (1,1%) – гандляры, 209 (2,8%) – іншых прафесій. Дзве трэці асаднікаў паходзілі з тэрыторый, якія да 1917 г. знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі. Па месцы нараджэння 41,1% асаднікаў паходзілі з цэнтральнай Польшчы, 19,6% – з усходніх зямель, 9,7% – з зямель, якія ўваходзілі на той час у СССР, 23,8% – з Малапольшчы, 4,4% – з заходніх зямель, 1,4% – з іншых тэрыторый. Па сваім канфесійным складзе 98-98,5% вайсковых асаднікаў былі каталікамі, 1,3% – праваслаўнымі, 0,1% – пратэстантамі, 0,2% – іншых веравызнанняў (сярод іх 3 іудзеі). З 94 праваслаўных асаднікаў "Крэсаў Усходніх" 40 чалавек атрымалі зямлю на Палессі, 28 – на Навагрудчыне, 1 – на Віленшчыне, а 25 – на Валыні [6, s. 121-126].

Разам з вайсковымі польскія ўлады ўсяляк заахвочвалі перасяленне сюды і цывільных (грамадскіх) асаднікаў, якія займалі тут пасады чыноўнікаў і настаўнікаў, але гэты працэс у параўнанні з насаджэннем вайсковага асадніцтва не набыў такога маштабу і размаху. Некаторыя цывільныя асаднікі потым нават перайшлі ў вайсковае асадніцтва.

Колькі ўсяго асаднікаў атрымала зямлю на тэрыторыі Заходняй Беларусі, дакладна невядома, бо гэтая інфармацыя адносілася да вайсковага ведамства і

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

мела высокую сакрэтнасць, але, як мяркуюць вучоныя, за 1921 – 1939 гг. на тэрыторыю Заходняй Беларусі перaселена каля 6000 вайсковых асаднікаў, якія сталі тут сацыяльна-палітычнай апорай польскіх улад [7, с. 77; 8, с. 31].

У аграрнай палітыцы польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі прадугледжвалася і камасацыя, што азначала масавую хутарызацыю сялянскіх гаспадарак. 31 ліпеня 1923 г. Сеймам прыняты закон аб камасацыі, але масава яна стала праводзіцца з 1927 г. [9, s. 23].

Сяляне павінны былі плаціць за камасацыю ад 14 да 20 злотых з кожнага гектара зямлі ў залежнасці ад яе якасці, а таксама за складанне праектаў меліярацыі, утрыманне землеўпарадчыкаў, перанясенне дарог і г.д. Таму камасацыя першапачаткова праходзіла марудна – з мэтай яе паскарэння 14 студзеня 1927 г. выдадзена сумеснае распараджэнне Міністэрства зямельных рэформ і Міністэрства фінансаў аб аказанні дапамогі сялянам, якія з вёскі перасяляліся на хутары. На 15-гадовы тэрмін выдаваўся крэдыт: 1200 злотых на перанос будынка і стварэнне хутара, а таксама 600 злотых на меліярацыю [3, с. 28].

Камасацыя была прагрэсіўнай з'явай – садзейнічала ліквідацыі цераспалосіцы, стала працягам сталыпінскай аграрнай рэформы. Правядзенне хутарызацыі ўскладнялася цяжкім матэрыяльным становішчам: абсалютная большасць кандыдатаў на перасяленне была неплацежаздольнай. У адказ на гэта польскі ўрад прапанаваў крэдыты, але яны не змаглі выправіць сітуацыю карэнным чынам: польскія эканамісты пісалі, што для вядзення нармальнай гаспадаркі і выплаты працэнтаў па крэдыту неабходна выдзяляць на хутар па 15-25 га зямлі (больш бедняку было не пад сілу апрацаваць, бо ў яго не хапала сродкаў і свойскай жывёлы для яе апрацоўкі), а выдзялялася па 4-8 га на сям'ю [10, с. 17].

У плане аграрнай рэформы (на аснове законаў, прынятых Сеймам Другой Рэчы Паспалітай 7 мая 1920 г. і 10 студзеня 1922 г.) прадугледжвалася ліквідацыя сервітутаў дабравольным ці прымусовым шляхам. Закон 10 студзеня 1922 г. устанаўліваў, што "ліквідацыя сервітута павінна кампенсавацца зямлёю і лесам ці наяўнымі грашыма толькі ў выпадку дамовы абодвух бакоў. Калі ж сервітут ліквідаваўся ў прымусовым парадку, то грашовая кампенсацыя дапускалася толькі ў якасці выключэння, а менавіта: а) калі землі, абцяжараныя сервітутамі, ужо распарцаляваны (разбіты) на дробныя надзелы; б) калі ліквідаваныя сервітуты могуць быць кампенсаваны толькі лесам, маючым абарончае значэнне, ці калі плошча, занятая лесам, непрыдатна для выкарыстання пад ворныя землі" [8, с. 36-37].

Сервітуты былі, з аднаго боку, перажыткам з часоў паншчыны, а з другога – жыццёва неабходнай для сялян рэччу: яны давалі ім магчымасць трымаць на выганах, пашах большую колькасць свойскай сельскагаспадарчай жывёлы, а на вадаёмах – вялікую колькасць хатняй птушкі, лавіць рыбу, а таксама нарыхтоўваць лес, магчымасць бесперашкодна збіраць ягады, грыбы, мох і г.д.

У цэлым сялянства Заходняй Беларусі выступала рэзка супраць ліквідацыі сервітутаў, бо страчвала значна больш, чым атрымоўвала ўзамен. Ліквідацыя сервітутаў мела для сялян цяжкія наступствы: 75% сервітутных зямель перайшло ва ўласнасць памешчыкаў і асаднікаў, таму праходзіла галоўным чынам у прымусовым парадку і стала самым складаным мерапрыемствам падчас правядзення аграрнай рэформы. З 1923 па 1938 г. 115,7 тыс. сялянскіх гаспадарак Заходняй Беларусі страцілі сервітуты, узамен сяляне атрымалі 189 тыс. га неапрацаванай зямлі і кампенсацыю ў 127,1 тыс. злотых [3, с. 28-29].

Парцэляцыі падлягалі маёнткі, што належалі дзяржаве, іншаземцам, рускаму сялянскаму банку, царкве, ліквідаваным манастырам, набытыя ў час вайны

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

пры дапамозе ліхвярства. Маёнтак, або частка яго, у прымусовым парадку павінен быць выкуплены ад прыватных уладальнікаў, але прымусоваму выкупу не падлягала прыватная зямельная ўласнасць ад 60 да 180 га, а ва ўсходніх ускраінах, а таксама ў былой прускай частцы Польшчы, прыватная зямельная ўласнасць абмяжоўвалася 400 га [8, с. 30-31; 9, s. 21].

Пры правядзенні парцэляцыі паветы падзяліліся на раёны па якасці ворнай зямлі. Так, Пінскі павет падзялілі на чатыры раёны: першы – паблізу Пінска, 1 га ворнай зямлі IV класа каштаваў 900 злотых, V – 600, VI – 400 злотых; другі раён – сярэдні кошт зямлі IV класа – 600 злотых, V – 450, VI – 350 злотых і г.д. Трэба адзначыць, што кошт зямлі ў Заходняй Беларусі быў самым нізкім: калі ў Віленскім ваяводстве за 1 га зямлі давалі 450 злотых, у Навагрудскім – 830, то ў Кракаўскім – 3310, у Варшаўскім – 1 320 злотых. У сувязі з тым, што па ўсёй Рэчы Паспалітай за 1919 – 1925 гг. у рукі сялян перайшло толькі 740 тыс. і вайсковым асаднікам – 126 тыс. га, у тым ліку прыватная парцэляцыя склала 503 тыс. га, стала зразумела, што рэформа аказалася нерэалізаванай [3, с. 27].

Падводзячы вынікі, неабходна адзначыць, што аграрная палітыка польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг. была накіравана на адраджэнне разбуранай дашчэнту пасля першай сусветнай і савецка-польскай вайны 1919 – 1920 гг. сельскай гаспадаркі краю, на ўмацаванне эканамічных пазіцый мясцовага сялянства, яна садзейнічала ліквідацыі паўпрыгонніцкіх перажыткаў, расчышчала шлях для развіцця капіталізму ў вёсцы, спрыяла пашырэнню ўнутранага рынку. Галоўным мерапрыемствам польскай аграрнай палітыкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў разглядаемы перыяд стала насаджэнне вайсковых асаднікаў, якія выступалі ў якасці каланізацыйнага элементу і палітычнай апоры польскіх улад на землях Заходняй Беларусі.

*ЛІТАРАТУРА*


1. ***Грэсь, С.М.*** Вынікі аграрных пераўтварэнняў і іх уплыў на стан сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг. / С.М. Грэсь // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 1. – 2004. – № 4. – С. 15-19.
2. ***Galka, B.W.*** Ziemianie i ich organizacje w Polsce lat 1918 – 1939 / B.W. Galka. – Torun: Adam Marszalek, 1999. – 214 s.
3. ***Зялінскі, П.І.*** Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1919 – 1939 гг.) / П.І. Зялінскі // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі 17-18 верасня 1999 г. – Мінск: БДУ, 2000. – С. 24-30.
4. Historia chlopow polskich / pod redakcja Stefana Inglota. – Wroclaw: Wydawnictwo Uniwersytetu Wroclawskiego, 1995. – 395 s.
5. ***Studnicki, W.*** W sprawe osadnictwa zolnierskiego na ziemiach Wshodnich / W. Studnicki. – Warszawa: Druk sunow St. Niemiry, 1922. – 12 s.
6. ***Stobniak-Smogorzewska, J.*** Kresowe osadnictwo wojskowe 1920 – 1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. – Warszawa: Instytut studiow politycznych PAN oficyna wydawnicza RYTM, 2003. – 431 s.
7. ***Сорокин, А.А.*** Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920 – 1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск: Наука и техника, 1968. – 204 с.
8. ***Кухарев, Б.Е.*** Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919 – 1939 гг.) / Б.Е. Кухарев. – Минск: Вышэйшая школа, 1975. – 112 с.
9. ***Ludkiewicz, Z.*** Wytyczne reformy agrarnej na Bialej Rusi / Z. Ludkiewicz. – Warszawa: Wydawnictwo STRAZY KRESOWEJ, 1920. – 40 s.
10. ***Грэсь, С.М.*** Аграрная палітыка польскай санацыі ў II-й палове 20 – 30-х гадоў XX стагоддзя / С.М. Грэсь // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 1. – 2005. – № 4. – С. 15-19.


Паступіў у рэдакцыю 28.02.2008 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова